**УДК 930**

# МАЯ БЕЛАРУСЬ І ЯЕ ГІСТОРЫЯ

*Н.С. Бернадскі, Ю.А. Кірпічэнка, навучэнцы гр. 425*
*Т.В. Міронава, выкладчык*
*УА «Мінскі дзяржаўны каледж тэхналогіі І дызайну легкай прамысловасці»*

Франтавікі,Баяны,аднасельцы,
Насельнікі аблок і гарадоў…
Усё ў адным шчасліва-горкім сэрцы:
Гісторыя. Трагедыя. Любоў…
Я. Янішчыц "Арліны храм.Узмежак беразовы…"

**Уводзіны.** Вялікая Айчынная вайна. Якія асацыяцыі ўзнікаюць у Вас, калі Вы чуеце гэта слова? А ў нас гэта слова асацыіруецца са словамі: „смерць", „слезы", холад", голад", разбураныя гарады і вёскі", „стогн", „плач", „страта блізкіх, сяброў, каханых". Страшныя малюнкі. Пакуты нашай краіны. Пра гэта сведчаць і 9 тысяч помнікаў і захаванняў Вялікай Айчыннай вайны.

Помніць ці не? Рабіць выгляд, што гэта было даўно і нам гэта невядома? Ці наадварот, быць удзячнымі ветэранам за перамогу, за мір і шчасце на зямлі?

Актуальнасць тэмы нашай работы у тым, што, сёння, калі многія хочуць перапісаць гісторыю Вялікай Айчыннай вайны, перагледзець яе вынікі, знішчаюць помнікі, зрываюць мемырыяльныя дошкі, апаганьваюць магілы, нам трэба рабіць усе, каб памяць пра тыя славутыя старонкі гісторыі не гублялася, а захоўвалася, была важным атрыбутам сённяшняга нашага жыцця, каб веды пра подзвіг нашых землякоў не страчваліся з цягам часу, каб кожны малады чалавек мог сказаць: „Ведаю. Спачуваю. Памятаю. Ніколі не забуду".

Мэта нашай работы: фарміраванне актыўнай грамадзянскай пазіцыі, каштоўных адносін да гісторыі і культуры роднага краю, пачуцця дачынення да мінулага і сучаснага- гэта міф ці праўда?

Задачы работы:

1. Аднавіць у памяці трагічныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны.
2. Вярнуцца ў старажытнасць каб спытаць, хто мы ёсць сёння-беларусы-патрыёты ці баязліўцы?
3. Прыгадаць подзвігі салдат у гады Вялікай Айчыннай вайны.
4. Высвятліць адносіны моладзі да падзей Вялікай Айчыннай вайны.

Аб`ект даследавання: Вялікая Айчынная вайна.

Прадмет даследавання: адносіны маладых людзей да падзей Вялікай Айчыннай вайны.

Метады даследавання: анкетаванне, назіранне, аналіз, сінтэз.

**Асноўная частка.** Як можна сёння адрадзіць часы гісторыі на Беларусі?

Як можна сёння перадаць тыя пачуцці, якія хвалявалі людзей раней і якія хвалююць іх і зараз?

Складаныя пытанні і такія ж складаныя адказы на іх. Але зямля продкаў вяртаецца да нас толькі тады, калі мы любім сваю зямлю, шануем яе, калі мы жывём на ёй і калі мы гэтае жыццё ствараем сваімі рукамі.

Мінск - горад - герой. Нябачны дух гісторыі жыве ў ім і на маёй вуліцы Алеся Гаруна, і ў маім доме. Я жыву на гэтай зямлі, вучуся, спазнаю гісторыю роднага краю, прыгажосць і непаўторнасць роднага слова на занятках гісторыі, беларускай мовы і літаратуры ў маім каледжы тэхналогіі і дызайну лёгкай прамысловасці. А сёння я зноў іду па маёй зямлі пешшу, таму ў мяне ёсць час, каб паразважаць.

Крок першы. Гісторыя. Вайна. Перамога. Людзі. Лёсы.

Пачынаю. Вялікая Айчынная вайна. І сапраўды, аднаго разу я задумалася, чаму свята 9 Мая нельга забыць? Звярнулася да гісторыі Беларусі. Аказалася ўсё не так проста.

Прыгадваю. На беларускай зямлі Вялікая Айчынная вайна доўжылася тры гады адзін месяц шэсць дзён (з 22 чэрвеня па 28 ліпеня 1944 года). Першыя дні вайны. Гераічная абарона Брэсцкай крэпасці. Дваццаць тры дні і ночы не здаваўся Магілёў. Аперацыя "Баграціён". Трыста семдзесят чатыры тысячы партызан. Чацвёрты па велічыне ў Еўропе лагер смерці "Трасцянец". Больш двухсот тысяч знішчаных людзей. Жудасны дзіцячы канцлагер у вёсцы Чырвоны Бераг, дзе самымі бесчалавечнымі спосабамі з юных ахвяр – да смерці – забіралі кроў для патрэб нямецкіх шпіталяў. Азярыцкая зона смерці, дзе пад адкрытым небам нацысты трымалі тысячы хворых на сыпны тыф, каб пасля выкарыстаць іх у якасці бактэрыялагічнай зброі супраць наступаючай Чырвонай Арміі. Прыгадваю, адчуваю, сумую, веру. Страшныя малюнкі праходзяць перад маімі вачыма. І становіцца цяжка на душы, здаецца я чую боль, крыкі, бачу слёзы, пакуты, прадчуваю бяду, смерць.

Прадчуваю. Ведаю. Памятаю. Ніколі не забуду.

Іду далей па маёй зямлі.

Крок другі. Гісторыя. Легенды. Паданні. Міфы. Людзі. Лёсы.

Першы крок быў самы для мяне цяжкі. Хачу перавесці дыханне: вяртаюся ў старажытнасць,прыгадваю легенду “Слёзы Рагнеды”. Давайце паглядзім, якія ж мы беларусы.

У полацкага князя Ізяслава памірае маці. Ён, моцны, дужы, слаўны князь, сумуе па ёй. Заехаўшы ў горад, адразу, не пераапранаючыся з дарогі, не глынуўшы, нягледзячы на вялікую смагу, нават кроплі вады, кінуўся да труны маці. І падумаў: ″Усё роўна, як быццам спіць. Тое ж самае, мабыць, адчувае дрэва, калі яго сякерай па каранях.″

Стары слуга Ігнат перадаў апошнюю просьбу маці. Яна хацела, каб пасля яе смерці сын паклапаціўся аб яе крынічках. Маці дала ім цікавыя імёны – Княгінька і Чарніца. Ізяслава зацікавілі гэты словы. Чаму маці іх так назвала Ігнат не ведаў. І тады Ізяслаў стаў услухоўвацца ў шум вады. Плач і жалоба чуліся ў вірлівай плыні Княгінькі. Нібы білася яна аб камяні, як чалавек у роспачы. Затое сумна, ціха, нібы чытаючы малітвы, журчала Чарніца.

Каб прагнаць смагу, Ізяслаў зачэрпнуў вады рукою, паспытаў. Вада была салёная. Ён падбег да другой крыніцы – салёная таксама! Тады вады пакаштаваў стары Ігнат. Для яго вада была звычайная. Ізяслаў задумаўся: чаму для адных вада ў крыніцы салёная, а для другіх – звычайная? А потым зразумеў: салёнаю вада будзе для тых людзей, якія не могуць цярпець крыўду, чые кулакі сціснуцца ад нянавісці да ўсіх ворагаў, бо ў іх жыве боль за сваю зямлю, лёс якой так падобны на лёс Рагнеды. І гэтыя людзі ўжо не змогуць жыць спакойна, а пачнуць змагацца за свабоду і шчасце сваёй зямлі. Для іншых вада будзе звычайнаю.

Крок трэці. Гісторыя. Памяць. Людзі. Лёсы.

Гэта ўжо не легенда, гэта наш сённяшні час. І я прыгадваю значную падзею 2020 года – 75-годдзе з дня Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Вясна. Май. Перамога. Ветэраны.

Як героі з легенд, змагаліся яны за волю і шчасце свайго народа, за сваю зямлю. Надыдзе дзень, калі ўжо не будзе спісу ветэранаў, калі не будзе сустрэч аднапалчан і да помніка салдатам, загінуўшым у час Вялікай Айчыннай вайны, закрочыць адзін, апошні ветэран. Адзін за ўсіх, адзіны на нашай роднай зямлі. Пройдзе да агню, медалямі звонячы, стане на калені і заплача.

Ветэраны. Героі сённяшняга нашага жыцця. Героі не літаратурных твораў, а сапраўдныя, жывыя, мужныя і смелыя, непераможныя, як непераможная наша зямля.

У працэсе падрыхтоўкі работы намі было праведзена анкетаванне навучэнцаў нашага каледжа гр.429, 420, спецыяльнасці „ Абдызайн”. Удзельнічалі навучэнцы па жаданню. Ім былі прапанаваны наступныя пытанні:

1. Пералічыце вядомыя вам помнікі, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне.
2. Калі вы апошні раз там былі?
3. Ці можна лічыць 9 Мая святам?
4. Пачатак і канец вайны.
5. Што вы ведаеце пра яе?
6. Чаму мы помнім пра герояў?
7. Вашы адносіны да ветэранаў.
8. Што такое актыўная грамадзянская пазіцыя?
9. Патрыятызм—гэта…
10. Гісторыю патрэбна ведаць?

Вынікі:

1. Помнікі Вялікай Айчыннай вайне ведаюць: 3 помніка—3, 4 помніка—9, 5 помнікаў—4, 6 помнікаў—3, 7 помнікаў—3, 8 помнікаў—2 чалавекі.
2. Калі была вайна, ведаюць—22, не ведаюць—2 чалавекі.
3. У музеі Вялікай Айчыннай вайны былі ўсе 24 чалавекі; на Кургане Славы—20, у Хатыні—15.
4. Герояў вайны не называюць.
5. Да ветэранаў ставяцца ўважліва.
6. Ход вайны ніхто узнавіць не змог.
7. Гісторыю ведаць трэба—24 чалавекі.

**Заключэнне**: Дзесьці там, у нябёсах, нараджаюцца гукі, якія нам не чутны. Дзесьці там, у мінуўшчыне Беларусі, нараджаюцца імёны, якія авалодваюць нашым жыццём, нашым поглядам, у свет невядомы. Так нараджаюцца тыя асобы, покліч якіх нашу душу цярэбіць, звяртае да продкаў і з позірку на якіх адраджаецца спадчына наша, мой родны кут, які мы шукаем сёння і гісторыя якога не павінна згаснуць у нашых сэрцах і ў сэрцы кожнага беларуса ніколі.

**ЛІТАРАТУРА**

1. А. Акулава „Пра тых, хто перамог вайну” Т.2 М ..Імперыумпрэс”, 2006./
2. Знешняя палітыка Беларусі: зборнік дакументаў і матэрыялаў/ Беларускі навукова-даследчы інстытут, дакументазнаўства і архіў. —Мінск: БелНДІДАС. Выд. цэнтр БДУ, 2001. —Т.4: Чэрвень 1941—жнівень 1945г.[складальнік.: Н.М. Дзятчык]
3. Легенды і паданні/ [ Склад. М.Я. Грынблат і А.І. Гурскі; рэд. Тома А.С. Фядосік ] – 2-е выд., дапрац.—Мн.: Бел. Навука, 2005.— 552с.
4. Кадзет М.Ф., Саламаха Ул.П. Наша Перамога. Хроніка Вялікй Айчыннай вайны. —Мн., Літаратура і Мастацтва, 2004г. —319с.
5. Лемяшонак У.І. Вызваленне—без грыфа „Сакрэтна!”. — мн. Веды 1996г.— 150с.
6. Новік Я.К., Марцуль Г.С. Гісторыя Беларусі ў двух частках. Частка 2— мн.: Універсітэцкае—1998г.—464с.

**УДК 330.1**

## СУЩНОСТЬ И МИФЫ ЭКОНОМИЧЕСКОГО НЕРАВЕНСТВА

*Мацкевич С. А., учащийся гр. 1909*
*Нестер Т. В., преподаватель*
*Филиал БГЭУ “Минский финансово-экономический колледж”*

**Введение.** В настоящее время в обществе сохраняются дискуссии об экономическом неравенстве. Сегодня один процент населения земли владеет половиной мирового богатства [1]. Состояние десятка богачей, входящих в топ списка Forbes, превышает 500 млрд $, а это больше годового ВВП многих стран мира, в том числе и стран Европы.

По ежегодным отчетам таких организаций, как Oxfam, расслоение в мире только усиливается, а пресловутый один процент населения продолжает богатеть, в связи с чем, тема сейчас актуальна, в том числе и для нашей республики [2]. Как сообщают представители Всемирного банка, «неравное экономическое развитие регионов наблюдается в Беларуси и сохранится в ближайшем будущем, в минувшем году валовой региональный продукт на душу населения в столице был вдвое выше показателя в областях» [3]. Данная проблема не остается без внимания со стороны правительства Республики Беларусь. В Национальном перечне показателей Целей устойчивого развития существует отдельный пункт «Сокращение неравенства внутри стран и между ними» [4].

Большинство людей считают, что для сокращения бедности необходимо существенное сокращение неравенства. Но действительно ли одно неизбежно порождает другое? Возможна ли ситуация, при которой экономическое неравенство будет оставаться таким же высоким или даже расти, в то время как уровень бедности будет уменьшаться?

Цель работы – проанализировать сущность экономического неравенства как социального явления. Задачи работы – изучение методик определения экономического неравенства, анализ мифов, связанных с экономическим неравенством. Для раскрытия темы используется метод анализа исследований ученых Национальной академии наук Беларуси проф. Г. Н. Соколовой, Е. В. Тарановой, М. И. Горбач, анализ исследований российских экспертов и др.

**Основная часть.** Экономическое неравенство – это различие по показателям экономического благосостояния между отдельными лицами в группе, группами населения или между странами.

Существуют методы оценки экономического неравенства, которые применяются и белорусскими учеными:

1) Децильный коэффициент – соотношение между доходами/имуществом 10 % самых богатых и 10 % самых бедных. Он показывает, во сколько раз минимальные доходы 10% наиболее обеспеченного населения превышают максимальные доходы 10% наименее обеспеченного населения в конкретной стране. Г.Н. Соколова приводит данные: «Так, соотношение располагаемых ресурсов между 10% наиболее и 10% наименее обеспеченного населения в Республике Беларусь составляло в 1995 г. - 5,5, в 2000 г. - 5,8, в 2005 г. - 5,4, в 2008 г. –5,9 и в 2009 г. - 5,6 раза» [5].

2) Коэффициент Джини – статистический показатель степени расслоения общества конкретной страны или региона по какому-либо изучаемому признаку. Он изменяется от 0 до 1. Чем больше его значение отклоняется от нуля и приближается к единице, тем в большей степени доходы сконцентрированы в руках отдельных групп населения. Г.Н. Соколова приводит данные: «Коэффициент Джини в Республике Беларусь составлял в 1995 г. – 0,261, в 2000 г. – 0,270, в 2005 г. – 0,254, в 2008 г. – 0,274» [5].

3) Дифференциация доходов населения - разница в уровне денежных доходов различных слоёв и групп населения. Е.В. Таранова сравнивает доходы населения Республики Беларусь с бюджетом